никновенного родства с авторами, художниками. Большой, мощный и целостный, Г. И. Барышев соединял в своем научном творчестве и преподавании эпохи, образы, людские судьбы.

# Г. І. БАРЫШАЎ ЯК ЛЮСТЭРКА БЕЛАРУСКАГА ТЭАТРАЗНАЎСТВА, АБО ПРА НЕКАТОРЫЯ ТЭНДЭНЦЫІ СУЧАСНАГА ТВОРЧАГА ПРАЦЭСУ

***Р. Б. Смольскі,***
*доктар мастацтвазнаўства, прафесар,*
*прафесар кафедры гісторыі і тэорыі мастацтваў,*
*галоўны навуковы супрацоўнік навукова-даследчага аддзела*
*Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў*

Гурый Іларыёнавіч Барышаў – постаць для беларускай культуры XX ст. вельмі адметная і змястоўная. Ужо сам пералік яго навуковых і творчых інтарэсаў і практычных здзяйсненняў выклікае павагу і ўсведамленне выключна значнага маштабу асобы Г. І. Барышава, яго заўважнай ролі для беларускай гуманітарнай навукі і мастацкай адукацыі.

Яго ўнёсак у вывучэнне беларускай нацыянальнай тэатральнай культуры агульнавядомы. У многіх напрамках ён быў своеасаблівым Калумбам, адкрываў для нас уражлівае багацце беларускага сцэнічнага мастацтва XVIII ст., паклаў пачатак вывучэнню сцэнаграфіі і шмат яшчэ іншых новых дадатных з'яў айчыннай культуры і мастацтва. Вельмі важна, што яго навуковыя здабыткі не пакладзены ў архіў, а актыўна працуюць ужо ў новай прасторы XXI ст. Новыя пакаленні беларускіх тэатразнаўцаў працягваюць многія напрамкі, якія распачынаў і разгадваў сам Г. І. Барышаў. Усё гэта пашырае і паглыбляе нашы веды і ўяўленні аб гістарычных і сучасных шляхах развіцця багатага на падзеі беларускага тэатральнага мастацтва. Адначасова постаць Г. І. Барышава, яго прыклад натхняе на новыя даследаванні разнастайных, складаных і нярэдка супярэчлівых з'яў у тэатральным працэсе, здабыткаў і праблем у творчай дзейнасці беларускіх майстроў сцэнічнага мастацтва.

Калі гаварыць пра сучасны беларускі драматычны тэатр, то адразу трэба ўсведамляць, што гэта надзвычай шырокая і вель-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мі разнастайная з’ява нашай нацыянальнай мастацкай культуры. Мы часта любім згадваць славутую і шырокавядомую шэкспіраўскую тэзу: тэатр – люстэрка свету, а людзі ў ім – акцёры. У гэтай своеасаблівай вобразна-філасофскай формуле – глыбінная сутнасць сцэнічнага мастацтва, яго эстэтычная адметнасць і безумоўная творчая моц, якая дазваляе тэатру вось ужо некалькі тысячагоддзяў упэўнена ісці поруч з цывілізацыяй, дапамагаць чалавеку жыць, удасканальвацца, пераадольваць цяжкасці, нарэшце, захоўваць у чалавеку яго спрадвечныя маральныя якасці. Менавіта з такіх пазіцый і трэба падыходзіць да вызначэння ўзроўню сучаснага беларускага тэатра, яго культурнай і грамадскай ролі ў сённяшніх варунках рэчаіснасці і гістарычных пераўтварэнняў, што адбываюцца літаральна на нашых вачах.

Шматлікія праблемы сённяшняга тэатральнага працэсу абумоўлены не толькі аб’ектыўнымі эканамічнымі, сацыяльнымі, палітычнымі і іншымі законамі развіцця сучаснага этапа айчыннай гісторыі, але і ўласна творчымі. Многія відавочныя недарэчнасці і складанасці ў развіцці сучаснага сцэнічнага мастацтва звязаны з адсутнасцю сістэмнага падыходу да агульнай арганізацыі тэатральнай справы як неад’емнай, важнай і ствральнай часткі ўсёй нацыянальнай беларускай культуры і грамадскага жыцця. Напрыклад, у пачатку нулявога дзесяцігоддзя пачалася кампанія па развіццю так званых платных паслуг у сферы культуры. Гэты паказчык стаў фактычна галоўным у вызначэнні эфектыўнасці дзейнасці ўсіх дзяржаўных тэатраў нашай краіны. «Даеш план па платных паслугах любой цаной!» – такі вось своеасаблівы «рынкавы» лозунг сённяшняга часу. Можна пачуць і больш радыкальныя ідэі аб пераводзе дзяржаўных тэатраў на самафінансаванне і самаакупнасць. Заўважу адразу, што зарабляць сродкі – справа заўсёды патрэбная, актуальная, а ў рынкавых умовах наогул непазбежная. Хто ж супраць?!.. Але ў дачыненні да тэатра тут хаваецца адна сур’ёзная і вельмі небяспечная праблема. Яна заключаецца ў тым, што неабходнасць зарабляць падштурхоўвае дзеячаў сцэны міжволі ісці на розныя творчыя і ідэйна-эстэтычныя кампрамісы, якія потым адгукаюцца новымі негатыўнымі з’явамі. У выніку тэатр як мастацтва з вялікай літары са сваімі ўнікальнымі культурнымі і сацыяльнымі функцыямі і задачамі ў жыцці грамадства, чалавека, дзяржавы паступова і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

няўмольна пераходзіць у іншую, усім нам вядомую сферу – сферу паслуг па баўленню вольнага часу, сферу, у якой правіць баль так званая масавая культура са сваімі пэўнымі асаблівасцямі, агрэсіўнымі законамі, неразвітымі эстэтычнымі каштоўнасцямі і іншымі спажывецкімі прыярытэтамі. Тут ужо на першыя пазіцыі выходзіць крытэрый запатрабаванасці ў гледача. Менавіта ён – глядач – ператвараецца ў галоўнага «заканадаўцу», так бы мовіць, тэатральнай «моды», ён заказвае адпаведную свайму густу «музыку». Іншымі словамі, ужо не тэатр вядзе за сабой гледача і ўзвышае яго да пэўных эстэтычных вышынь, а глядач «апускае» майстроў сцэны да свайго, усім нам вядомага «масавага» ўзроўню. Складаная і супярэчлівая атрымліваецца сітуацыя ў «рынкавых» стасунках беларускага тэатра і айчыннага гледача.

Гэтыя і іншыя акалічнасці – аб'ектыўная гістарычная рэальнасць нашага часу, часу, які ўжо, вобразна кажучы, «зацяжарыў» менавіта рынкавымі асаблівасцямі і прыярытэтамі. Што і як будзе далей – пакажа бліжэйшая будучыня. Але дзеячам тэатральнага мастацтва трэба сёння працаваць, сёння ствараць сцэнічныя творы і выконваць сваю выхаваўчую, эстэтычную, маральную і патрыятычную місію – адным словам, рабіць тое, да чаго ўвесь час настойліва заклікае майстроў беларускай літаратуры і мастацтва Кіраўнік нашай дзяржавы. Вось і на сустрэчы 20 сакавіка 2018 г. з прадстаўнікамі творчай моладзі А. Р. Лукашэнка падкрэсліў, што задача дзеячаў кіно, тэатра, музыкі, выяўленчых і іншых відаў мастацтва – «фарміраваць духоўны каркас нацыі. Гэта дастойны і адказны шлях – весці свет за сабой, узвышаючы душы і выхоўваючы ў людзях пачуццё прыгожага» [1, с. 1].

У сучасных, вельмі складаных і супярэчлівых акалічнасцях часу, калі ідзе актыўны працэс фарміравання новых грамадскіх адносін, у тым ліку і фарміраванне новага чалавека, пажадана свядомага грамадзяніна, патрыёта Рэспублікі Беларусь, дзяржава праз свае адпаведныя структуры, найперш Міністэрства культуры, абласныя і гарадскія ўпраўленні культуры, грамадскія арганізацыі і творчыя саюзы, павінна больш цвёрда, паслядоўна, сістэмна праводзіць сваю ўзважаную і сістэмную культурную палітыку.

Сёння ідзе складаны, цяжкі і даволі супярэчлівы працэс пераасэнсавання кардынальнай ва ўсе часы праблемы – вызна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чэння дакладнай ролі і значэння літаратуры і мастацтва ў сучасным грамадскім жыцці. Тут варта прыгадаць адну прынцыпова важную акалічнасць. Яшчэ не так даўно ў айчынным (савецкім) мастацтвазнаўстве панавала даволі вядомая канцэпцыя так званай дзейнасці літаратуры і мастацтва, у якой яўна, як гэта мы бачым з усёй відавочнасцю зараз, перабольшвалася выхаваўчая роля мастацтва. Перабольшвалася, бо ніхто ж не будзе сур'ёзна адмаўляць пэўнай пазітыўна-стваральнай выхаваўчай ролі літаратуры і мастацтва ў жыцці цывілізаванага грамадства, асабліва ў заўсёды актуальнай і важнай справе выхавання маладога пакалення, умацавання лепшых нацыянальных традыцый і спрадвечных гуманістычных каштоўнасцей у грамадскай і прыватнай свядомасці. Сёння ва ўмовах дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь перад нашымі вучонымі паўстала вялікая і выключна актуальная задача вывучэння і абагульнення менавіта эканамічнага складальніка нацыянальнай тэатральнай культуры ва ўмовах пераходнага перыяду. Адным словам, комплексная праблема «тэатр і рынкавая эканоміка» патрабуе самага ўважлівага сістэмнага вывучэння агульнымі намаганнямі тэатразнаўцаў (яны павінны стаць завадатарамі ў гэтай справе!), а таксама эканамістаў, сацыёлагаў, культуролагаў, юрыстаў і іншых вучоных-гуманітарыяў.

Яшчэ адна актуальная і наспелая задача, якую трэба неадкладна вырашаць агульнымі намаганнямі тэарэтыкаў і практыкаў айчыннага тэатра, – рэфармаванне або мадэрнізацыя тэатральнай справы. Задача вельмі складаная і надзвычай адказная. Гэта абумоўлена рознымі прычынамі, у тым ліку і тым, што ў папярэдні савецкі перыяд айчыннай гісторыі ў нас склалася адзіная мадэль дзяржаўнага тэатра – стацыянарнага, рэпертуарнага, з пастаяннай трупай. Акрамя таго, так званы «жалезны занавес» даволі рашуча «адсёк» савецкіх майстроў сцэны ад мастацкай разнастайнасці сусветнай культуры: ад экспрэсіянізму, сюррэалізму, абсурду і іншых шматлікіх праяў тэатральнага авангарда. Натуральна, такое становішча не спрыяла назапашванню беларускім тэатрам адпаведнага мастацкага патэнцыялу, новых творчых праяў і адкрыццяў. Айчынныя дзеячы сцэны вымушаны былі «таптацца» на адной вялікай, але тым не менш абмежаванай тэрыторыі так званага «рэалістычна-псіхалагічнага тэатра» з пэўнымі ідэалагічнымі мэтамі і задачамі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Варта адзначыць пры гэтым, што існуючая мадэль дзяржаўнага рэпертуарнага тэатра даказала і паказала сваю жыццяздольнасць і вялікі творчы патэнцыял. Пра гэта яскрава сведчыць уся гісторыя савецкага перыяду беларускага нацыянальнага тэатра. Вось чаму праблема мадэрнізацыі існуючай мадэлі тэатра – вельмі складаная і ў той жа час наспелая задача, якую прыйдзецца вырашаць, калі мы сур'ёзна думаем пра плённае развіццё і паспяховае існаванне сцэнічнага мастацтва ў новай рэчаіснасці XXI ст.

Праблем і пытанняў у сферы тэатральнага мастацтва на ўсіх этапах яго развіцця, у тым ліку і сённяшняга, вельмі многа – складаных, важных, нярэдка супярэчлівых, але заўсёды актуальных для дзяржавы, грамадства, гледачоў, а таксама і найперш для саміх практыкаў і тэарэтыкаў сцэнічнай творчасці. Вырашаць іх неабходна, іншага не дадзена. Тут патрэбны калектыўныя намаганні не толькі тэатразнаўцаў, хаця яны павінны быць завадатарамі ў навуковых распрацоўках інавацыйных падыходаў, рэкамендацый, рашэнняў, але і іншых вучоных – эканамістаў, сацыёлагаў, культуролагаў, юрыстаў, філосафаў. Такое зараз аб'ектыўнае і надзённае патрабаванне сённяшняга «рынкавага» часу.

Спыніцца менавіта на гэтых канкрэтных пытаннях развіцця і мадэрнізацыі айчыннай тэатральнай справы ў кантэксце сучасных рынкавых пераўтварэнняў прымушае па сутнасці адна, але самая важная прычына. Справа ў тым, што неабходнасць мадэрнізацыі – гэта ключавая, лёсавызначальная праблема сённяшняга беларускага тэатра. Яна адначасова архіскладаная і вельмі надзённая не толькі для беларускага тэатральнага мастацтва, але і для ўсёй нацыянальнай культуры і гуманітарнай навукі. Тэатр быў, ёсць і будзе своеасаблівым і дакладным адбіткам усёй нацыянальнай культуры таго ці іншага народа, у тым ліку і беларускага.

Пра гэта, дарэчы будзе ячшэ раз нагадаць, выдатна і пераканальна паказаў у сваіх шматлікіх і змястоўных навуковых працах Г. І. Барышаў, якога мы шануем, памятаем і справу якога як вучонага і педагога самае галоўнае імкнемся дастойна працягваць.

---

*1.* Знайсці скарбы ў сябе [Электронны рэсурс] // Культура. – Рэжым доступу : www.kimpress.by/index.phtml. – № 12 (1347). – 23.03.2018–30.03.2018.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ